# «Пад небам памяці і слова»



*(90 год з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі І. Г. Чыгрынава)*

**Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў — народны пісьменнік Беларусі, публіцыст, драматург, сцэнарыст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, член Саюза пісьменнікаў СССР.**



**1934-1996**



Іван Чыгрынаў нарадзіўся 21 снежня 1934 года ў вёсцы Вялікі Бор Магілёўскай вобласці Беларускай ССР у сям'і старшыні сельсавета. У дзяцінстве перажыў Вялікую Айчынную вайну, на якой страціў бацьку. Пасля заканчэння Вялікаборскай сямігадовай школы Іван Чыгрынаў працягнуў навучанне ў Смалявіцкай сярэдняй школе. Тады, натхнёны творчасцю Аркадзя Куляшова, упершыню пачаў публікаваць у газетах свае вершы.



**У 1952 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Пасля заканчэння ўніверсітэта з 1957 па 1962 год працаваў у выдавецтве Акадэміі навук БССР. Як празаік дэбютаваў у 1958 годзе ў моладзевай газеце «Чырвоная змена». З 1965 па 1989 год — рэдактар аддзела публіцыстыкі часопіса «Полымя», сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, галоўны рэдактар часопіса «Спадчына».**










**Аўтар раманаў пра трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і перыяд аднаўлення ў Беларусі. Пісаў выключна на беларускай мове. За гады творчасці стварыў зборнікі апавяданняў «Птушкі ляцяць на волю», «Самы шчаслівы чалавек», «Ішоў на вайну чалавек», прысвечаныя жыццю і працы савецкіх людзей, героі і наступствы мінулай вайны.**

У рамане-трылогіі «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві» і «Свае і чужыя» аўтар перадаў драматызм падзей і чалавечых лёсаў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. За першыя два рамана трылогіі ён быў ўдастоены Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева.









Чыгрынаў перакладаў на беларускую мову п'есы «На дне» М. Горкага і «Аптымістычная трагедыя» В. Вішнеўскага.

Акрамя гэтага, ён заявіў пра сябе ў галіне крытыкі, публіцыстыкі і літаратуразнаўства, выдаўшы шэраг кніг і артыкулаў. Напісаў манаграфію пра этнографа і фалькларыста Н. Я. Нікіфароўскага.

Яго кнігі былі выдадзены за мяжой і перакладзены на многія мовы свету. У 1995 годзе выйшаў збор твораў аўтара ў шасці тамах.









Чыгрынаў браў удзел у стварэнні шасцісерыйнага тэлевізійнага фільма пра Мінскае падполле пад назвай «Руины стреляют...».

Яго праца як суаўтара сцэнарыя была высока ацэнена, і за гэта яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.









**У 1990 годзе Ігар Дабралюбаў зняў дзесяцісерыйны фільм «Плач перепелки», які быў заснаваны на аднайменным рамане Чыгрынава. Таксама па некаторых творах аўтара былі пастаўлены спектаклі.**



# ТВОРЫ ІВАНА ЧЫГРЫНАВА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ Д.Р. НОВІКАВА




**С(Бел)**
**Ч-975 з. т. /1**
**Чыгрынаў, І.**
**Збор твораў: у шасці тамах / І. Чыгрынаў. — Мінск : Мастацкая літаратура.**
**Т. 1 : Плач перапелкі. Апраўданне крыві : раманы/аўт. прадм. У. Юрэвіч. — 1995. — 589 с.**

**У першы том увайшлі раманы «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві». Раман «Плач перапёлкі» — першы твор з цыкла раманаў аб Вялікай Айчыннай вайне. У ім аўтар усхвалявана апавядае пра боль і пакуты, якія нясе людзям вайна. «Апраўданне крыві» працягвае тую ж тэму супраціўлення нямецка-фашысцкім захопнікам.**




**С(бел)**
**Ч-975 а. к.**
**Чыгрынаў, І.**
**Апраўданне крыві : раман / І. Чыгрынаў. — Мінск : Мастацкая літатратура, 1977. — 336 с.**

**Іван Чыгрынаў вядомы чытачу як аўтар кніг апавяданняў, раман «Плач перапелкі», у якім у лірыка-эпічнай форме знайшлі адлюстраванне першыя месцы Вялікай Айчыннай вайны, маральная сіла савецкага чалавека, яго мужнасць і воля. «Апраўданне крыві» — працягвае тую ж тэму супраціўлення нямецка-фашысцкім захопнікам. Чытач зноў сустрэне многіх герояў, якіх палюбіў у «Плач перапелкі».**




**Ч-975 с. ш.**
**Чыгрынаў. І. Г.**
**Самы шчаслівы чалавек. Апавяданні / І. Г. Чыгрынаў. — Мінск : Беларусь, 1967. — 232 с.**

**Гэта другая кніга апавяданняў Івана Чыгрынава. У ёй, як і у першай кнізе — «Птушкі ляцяць на волю», — пісьменік за аб’ект мастацкага асмыслення бярэ чалавека з яго думкамі і пачуццямі, з багатым духоўным светам.**




С (Бел)
Ч-975 с. і.
Чыгрынаў, І.
Свае і чужынцы : раман / І. Чыгрынаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. — 367 с.

Раман Івана Чыгрынава «Свае і чужынцы» з’яўляецца лагічным працягам папярэдніх твораў, прысвечаных першым найбольш цяжкім для савецкіх людзей месяцам Вялікай Айчыннай вайны. На яго старонках чытач сустрэнецца са сваімі даўнімі знаемымі — героямі раманаў «Плач перапелкі» і «Апраўданне крыві». Аўтар глыбока даследуе характары герояў, паказвае іх барацьбу і непахісную веру ў перамогу над ворагам.




**С(Бел)**
**Ч-586 и. п. /1**
**Чигринов, И. Г.**
**Избранные произведения : в двух томах / И. Г. Чигринов. — М. : Художественная литература.**

**Т. 1 : Рассказы. Плач перепелки : роман: пер. с белорус. / авт. вступ. ст. В. Оскоцкий ; худож. Г. Шипов. — 1987. — 431 с.**




Ч-586 з. с.

Чигринов, И. Г.

За сто километров на обед : рассказы : пер. с бел. / И. Г. Чигринов. — Минск : Мастацкая літаратура, 1979. - 288 с.

В книгу вошли лучшие рассказы известного белорусского прозаика Ивана Чигринова. Герои его рассказов — колхозники, рабочие, солдаты, партизаны гражданской и Отечественной войны, партийные, советские работники, наконец, во многих случаях сам рассказчик, немало походивший по земле.




**Ч-586 п. п.**
**Чигринов. И. Г.**
**Плач перепелки. Оправдание крови: романы : пер. с бел. / И. Г. Чигринов. — Москва : Советский писатель, 1980. - 504 с.**




**Ч-586 с. и.**
**Чигринов, И. Г.**
**Свои и чужие: роман : пер. с бел. / И. Г. Чигринов. — Минск : Мастацкая літаратура, 1988. — 300 с.**




**Ч-586 т. р.**
**Чигринов, И.**
**Третьим разом : рассказы: пер. с бел. / И. Чигринов. — Минск : Мастацкая літ., 1991. — 271 с.**

**Духовная атмосфера рассказов белорусского прозаика Ивана Чигринова чрезвычайно насыщена. Они отличаются также разнообразием тем. Осознавание героями своей принадлежности к роду людскому всегда показывается в них как значительный шаг на пути освоения человеческого в человеке.**




**Ч-586 ч. н.**
**Чигринов, И. Г.**
**Чайки на волнах : рассказы ; пер. с бел. — Минск : Юнацтва, 1988. — 272 с.**

**В настоящий сборник белорусского писателя вошли рассказы, написанные им в разные годы.**



# «Пад небам памяці і слова»



**(Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л. Д.)**